17. Історія України в документах і матеріалах / від. ред.: С.М. Білоусов. – Київ: Вид-во Акад. наук УРСР, 1941. – Т. 3. – С. 25.
18. Історія українського козацтва: нариси: у 2 т. – Київ: Києво-Могилянська академія, 2006. – Т. 1. – С. 544.
19. История Украинской ССР: в 10 т. / гл. ред.: Ю. Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 357.
20. Listy Stanislawa Żolkiewskiego (1584–1620). – Kraków, 1868. – S. 27; Kronika M. Bielskiego. – T. 3. – S. 1690–1691.
21. История Украинской ССР: в 10 т. / гл. ред.: Ю. Ю. Кондифор. – Киев : Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 357.
22. Історія українського козацтва: нариси у 2 т. – Київ: Києво-Могилянська академія, 2006. – Т. 1. – С. 88.
23. Плохій, Сергій. Наливайкова віра: Козацтво та релігія в раньомодерній Україні / Сергій Плохій. – Київ, 2005. – 496 с.; Gordon, Linda. Cossack Rebellions: Social Turmoil in the Sixteenth – Century Ukraine / Linda Gordon. – Albany, N.Y., 1983. – P. 99–142; Леп'явко, С. Козацькі війни кінця XVI ст. в Україні / С. Леп'явко. – Чернігів, 1996. – С. 45–92.
24. См. украинский перевод с латыни в кн.: «Українські гуманісти епохи відродження». – Київ, 1995. – Ч. 2. – С. 40–77.

# ГРАФІЦІ ПАЎДНЁВАГА КАМПАРТЫМЕНТУ ПОЛАЦКАЙ СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКАЙ ЦАРКВЫ: ВЫНІКІ КОМПЛЕКСНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

***І. Л. Калечыц,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі*
*УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"*

Паўднёвы кампартымент, які часцей ужываецца пад назвай "Паўднёвая келля" традыцыйна лічыўся месцам, дзе жыла і малілася прападобная Еўфрасіння Полацкая. Ён уяўляе сабой невялікую капэлу, крыжападобную ў разрэзе і распісаную фрэскамі на тэму жыція прападобнай Еўфрасінні Александрыйскай, патранэсы прападобнай Еўфрасінні Полацкай.

У паўднёвым капартыменце, як і ў астатняй прасторы храма знойдзены графіці. Іх колькасць складае каля 1200 надпісаў. Гэта вельмі высокая шчыльнасць для невялікага памяшкання. Пераважная большасць графіці запісана на лацінцы – 96 % ад усёй колькасці графіці.

Безумоўная большасць датаваных графіці на лацінцы прыпадае на XVII ст. Недатаваныя аўтографы на лацінцы складаюць больш за 40 % ад усёй колькасці надпісаў, з іх палова прадстаўлена імёнамі і прозвішчамі. Астатнія аўтографы прадстаўлены або імёнамі або прозвішчамі, імёнаў у 2,5 разы больш, чым прозвішчаў.

Датаваныя кірылічныя графіці прадстаўлены вузкім прамежкам канца XVI – пачатку XVII ст. Надпісы-varia на кірыліцы датуюцца XV ст., недатаваныя аўтографы, якіх у келлі прадстаўлена больш за 40, датуюцца па палеаграфічных даных часовым інтэрвалам ад XV да XVII стст. Надпісы-малітоўныя прашэнні на кірыліцы датуюцца часам ад XIV да XVI ст., што непасрэдна звязана з набажэнствамі ў храме. Малітоўная «формула» ў іх змяняецца з «Госпадзе, дапамажы» у XIV ст. на «выратуй, Госпадзе» ў XVI ст.

Літар і фрагментаў надпісаў досыць шмат. Даціроўка фрагментаў надпісаў, літар і малюнкаў дастаткова шырокая, бо дакладныя іх даціроўкі, асабліва даціроўкі малюнкаў, якія не суправаджаюцца надпісамі, усталяваць немагчыма.

Самыя старажытныя надпісы – гэта два малітоўныя прашэнні на кірыліцы, якія можна аднесці да XIV ст. На жаль, ні адно з іх не ўтрымлівае імя. Таксама старажытнымі запісамі з'яўляюцца рысачкі для абазначэння падліку колькасці малітваў, прачытаных за чалавека. Такіх запісаў у келлі знойдзена шэсць. Побач з імі няма ніякага надпісу.

Невялікую частку, крыху больш за сотай ад усёй колькасці надпісаў, складаюць манаграмы, дзве з іх запісаныя на кірыліцы. Малюнкі складаюць каля трох адсоткаў ад агульнай колькасці графіці. Яны прадстаўлены антрапаморфных малюнкамі, малюнкамі рук, геральдычнымі выявамі і знакамі уласнасці, «механічным» д драпаннем па сцяне (зігзагамі, рашоткамі і хвалістымі лініямі), а таксама геаметрычнымі малюнкамі ў выглядзе колаў і квадратаў), выявамі крыжоў. Памінальныя і азбучныя запісы адсутнічаюць.

Такім чынам, мы бачым, што ў самы ранні перыяд сцены келлі цалкам не запаўняюцца надпісамі. Адзінкавыя графіці з'яўляюцца ў XIV, XV і XVI стст. Гэта малітоўныя просьбы, памінальныя рысачкі, рэдкія аўтографы на кірыліцы і некалькі запісаў-varia, якія, у асноўным, звязаныя з царкоўным жыццём. Гэтыя надпісы не з'яўляюцца датаванымі. Мяркуючы па іх колькасці, доступ у келлю ня быў вольным. Магчыма, туды, як у мініяцюрны храм, мелі доступ толькі святары. Аднак такія віды графіці як памінальныя надпісы у келлі адсутнічаюць.

Колькасць графіці пачынае павялічвацца з 1578 г., што наўпрост звязана з падзеямі Лівонскай вайны. У келлі з’яўляюцца графіці, датаваныя жніўнем 1579 г., што ўкладаецца ў рамкі аблогі і ўзяцця Полацка (абкладзены войскамі 11 жніўня і ўзяты 31 жніўня 1579 г.) Аднак, у параўнанні з алтаром, надпісаў гэтага года і наогул канца XVI ст. у келлі няшмат. Самае позняе графіта XVI ст. у келлі датуецца 1597 г., у той час як на хорах самае пазней графіці XVI ст. датуецца 1598 г. Пасля гэтага года, па ўсёй верагоднасці, пачынаецца рамонт храма езуітамі. Ён заканчваецца ў 1604 г. У гэты час з'яўляюцца графіці Цімафея Міхалоўскага, датаваныя перыядам з 1604 па 1607 гг., аўтограф Маціаса Сабіны, датаваны 1604 г. Адным з будаўнічых новаўвядзенняў стала вылучэнне хор ўглыб храма, што, відаць, было звязана з жаданнем выкарыстоўваць храм як касцёл і ўсталяваць у ім арган. Хоры, мяркуючы па датаваным графіці, захоўваліся да 80-х гг. XVII ст.

У гэты невялікі перыяд у келлі зафіксаваныя графіці воінаў-наймітаў, якія датуюцца 1579–1584 гг. Некаторыя з аўтографаў, пакінутых у келлі, маюць аналагі ў іншых частках храма. Відаць, на тэрыторыі, якая прымыкае да храма, змянілася два гарнізона, бо ў графіці прасочваюцца перыяды 1579–1583 гг. (Аўтограф Каспара Бенеке) і 1583–1584 гг. (аўтографы Гердта Фагета). Чаму яны досыць доўга знаходзіліся тут? Магчыма, гэта нейкім чынам звязана з каляндарнымі бунтамі. На тэрыторыі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага грыгарыянскі каляндар выкарыстоўваўся ўжо з 1583 г., але яго ўвядзенне выклікала непрыманне ў праваслаўнага насельніцтва, у сувязі з забаронай на працу і гандаль у дні святаў па новым календары.

Далейшая гісторыі запаўнення кампартыменту надпісамі непасрэдна звязана з дзейнасцю езуітаў. 30 жніўня 1579 г. Сефан Баторый запрашае езуітаў з Вільні ў Полацк, затым сам едзе ў Вільню для перамоваў і перадае езуітам адну з замкавых цэркваў. 4 кастрычніка 1579 г. Баторый і Суньер (кіраўнік правінцыі) прымаюць рашэнне аб заснаванні калегіума. 10 чэрвеня 1580 г. у Полацак прыязджаюць Пётр Скарга, Станіслаў Ленчыцкі і Ян Аланда. Каралеўскія рэвізоры павінны былі вызначыць будучыя валодання езуітаў. У выніку невялікай групе езуітаў былі перададзеныя 6 (або 7) праваслаўных манастыроў, восем цэркваў і мыта з маста праз Дзвіну, Экімань для пабудовы калегіума і права збудаванні млына на Палаце. Тэрыторыя Спаскага манастыра таксама трапіла ў лік валоданні езуітаў. Тут была арганізавана загарадная рэзідэнцыя. У цёплыя летнія месяцы для канвіктараў – шкаляроў калегіўма арганізоўваліся працяглыя прагулкі, для шкаляроў полацкага калегіўма такія прагулкі праводзіліся да фальварка Спас. Таму зусім не дзіўна, што большасць датаваных надпісаў XVII ст. пры ўказанні месяца спасылаюцца на красавік – ліпень.

Верагодна, большасць надпісаў пакінута шкалярамі езуіцкага калегіума, якія вывучалі латынь. Пра гэта сведчыць вялікая колькасць «лацінізаваных» імёнаў: Ioannes, Petrus і нават Simon Simonides. Некаторыя перайначваюць на лацінскі манер не толькі імёны, але і прозвішчы. Але складваецца ўражанне, што доступ у келлю ў гэты час быў досыць вольным не толькі для шкаляроў калегіума. У келлі прысутнічаюць і надпісы полацкіх мяшчан: лекара, залатара, арганіста і г.д. Магчымы і той факт, што яны пакінулі свае аўтографы падчас навучання ў калегіуме.

Літаральна адзінкавыя надпісы паказваюць на тое, што храм у XVII ст. (выключаючы, безумоўна, перыяд пераасвячэння 1656–1667 гг.) успрымаўся менавіта як Божы дом – дом малітвы. Да такіх графіці можна аднесці графіці Карпа Спірыдавіча Оспанкі, запісанае на кірыліцы, і графіці Валентыя Альшэўскага на лацінцы.

Трасалогія графіці паказвае, што надпісы прадрапвалі самымі рознымі прадметамі. Сярод іх, мяркуючы па пакінутых слядах, былі нажы, іголкі, цвікі. Іголкі пакідалі тонкія паверхневыя або тонкія глыбокія сляды. Калі надпіс прадрапвалі нажом, г.зн. досыць шырокім і не вельмі вострым прадметам, то, часцей за ўсё, заставаліся шырокія сляды, края якіх не былі гладкімі. Іх можна назваць «рванымі», бо тынкоўка па абрысе літар абсыпалася. Калі надпіс працарапвалі досыць вострым і вузкім прадметам, такога не адбывалася.

Колькасць і шчыльнасць нанясення надпісаў таксама звязаныя з асветленасцю сцен. Большасць графіці наносілася пры дзённым святле, таму найбольш запоўненымі апынуліся тыя сцены, якія найбольш добра асветлены.

Аўтары графіці добра бачылі, дзе яны пісалі. Самыя раннія графіці, датаваныя XVI ст. з'яўляюцца на чырвоных разгранках паміж жыційнымі сюжэтамі як на самых прывабных, выдзеленых колерам месцах, якія ўяўляюць сабой як бы разлінаваны ў адзін радок паверхню, зручную для пісання. Мы бачым таксама прыклады нанясення надпісаў на німбы, абліччы, элементы адзення. Месцы для нанясення надпісаў хапала, але складваецца ўражанне, што аўтары графіці ўспрымалі выявы ў першую чаргу не як фігуры святых (ці не хацелі заўважаць і ўспрымаць выявы як сакральныя), а ўспрымалі часткі выявы як месца, зручна адведзенае для пісання, якое вылучае колерам надпіс на сцяне.

Напрыклад, надпісы не выходзяць за рамкі нізу адзення фігуры, які мае зялёны колер, хаця месца побач хапае. Безумоўна, гэта «неўспрыманне» малюнкаў як сакральных кажа аб канфесійнай прыналежнасці тых, хто пакідаў надпіс і як нельга лепш ілюструе міжканфесійныя адносіны, якія існуюць у гэты час.

Графіці зусім разнастайныя па манеры пісьма. Мы бачым з аднаго боку каліграфічныя і нават вычварныя надпісы (Альберт Касперскі і Дзягілевіч), надпісы, афармленыя мудрагелістымі рамкамі (Марыяш Міскевіч),

прадрапаныя падвойнымі і шматлікімі лініямі. І, у той жа час, вялікая колькасць надпісаў прадрапана неакуратна, або надпіс, распачаты глыбока прадрапанымі, выразнымі лініямі, да канца аўтографа змяняецца больш тонкімі, неакуратнымі, а то і зусім застаецца няскончаным. У гэтым выпадку можна меркаваць два варыянты: альбо аўтара надпісу «спудзілі» і ён не змог скончыць надпіс, альбо ён проста паленаваўся яго дапісваць.

Часам нежаданне пісаць выяўляецца ўжо пасля напісання першай літары. Магчыма, гэтым нежаданнем дапісваць аўтограф абумоўлена і прысутнасць вялікай колькасці складоў, фрагментарных надпісаў і няскончаных імёнаў і прозвішчаў. Фрагменты, хутчэй за ўсё, уяўляюць сабой пачатак імя, але не можам выключаць у гэтым выпадку і напісання прозвішча.

Графіці маглі прадрапваць на досыць вялікай вышыні – больш за 2,5 м. Туды жадаючыя пакінуць аўтограф маглі забрацца, наступаючы нагамі ў нішы і вокны. Ёсць графіці, запісаныя на зусім невялікай, каля 10 см, вышыні ад сучаснага ўзроўня падлогі.

У некаторых аўтографах назіраецца змешванне кірыліцы і лацінкі. Так, напрыклад, Захарыя Яновіч блытае літару н прозвішча, запісвае яе то кірыліцай, то лацінкай. Нейкі Марцін запісвае сваё імя на лацінцы, але апошняя літара запісваецца кірылліцай. У графіці канца XVI–XVII стст. таксама прасочваецца станаўленне прозвішчаў. Хаця прадстаўнікі аднаго роду, у асноўным, прытрымліваюцца аднаго і таго ж напісання, прозвішча, запісаная адным і тым жа чалавекам, можа чытацца варыянтна: Цішкевіч – Тышкевіч, Міхайловіч – Міхалоўскі, Тжышевічскі, Тжичевіч і Тжышевіч. У некаторых надпісах прысутнічае сімволіка езуіцкага ордэна, скарочаная ці поўнае яго назва.

Некаторыя аўтары надпісаў запісваюць свае аўтографы па некалькі разоў. Такія графіці маглі прадрапвацца на працягу аднаго візіту ў храм альбо на працягу аднаго года. Так, напрыклад, у Захара Янавіча ёсць некалькі аўтографаў 1636 г. Аднак, відаць, нанясенне надпіса часта мела сімвалічнае значэнне. Гэта маглі быць аўтографы, пакінутыя ў канцы і пачатку вучобы ў калегіуме. Напрыклад, паміж датамі нанясення графіці і дыпінта Іаана Садкоўскага праходзіць 7 гадоў: 1641–1647; у Паўла Гаслаўскага – 4 гады: 1645–1648; у Захара Яновіча – 3 гады: 1636–1638; у Захара Піатровіча – 8 гадоў: 1642–1649. Хаця сустракаюцца і іншыя часовыя інтэрвалы паміж аўтографамі, у 21 і 26 гадоў. У сярэднім, вучоба магла доўжыцца 6–7 гадоў. Першы клас мог быць падрыхтоўчым (уступным, proforma), далей тры класы граматыкі і два гады курсу рыторыкі завяршалі сярэднюю адукацыю. Пасля сярэдняй школы ішоў клас філасофіі – 2–3 гады. Аднак у адным класе вучні маглі сядзець па некалькі гадоў, што звязвалася з высокімі патрабаваннямі да ўзроўню ведаў вучняў.

Графіці могуць даць звесткі аб рамонтах, якія праводзяцца ў храме. Так сцены ўсходняга рукава унізе пакрытыя позняй рамонтнай тынкоўкай. Гэтую ж тынкоўку можна бачыць і ў іншых месцах келлі. Тынкоўка закрывае датаваны 1649 г. аўтограф Захара Піатровіча, і, у той жа час, на ёй з'яўляецца фрагмент аўтографа Антонія Любавецкага, датаваны, праўда на другой сцяне, 1703 г. Таксама на ўсходняй сцяне паўднёвага рукава ёсць аўтограф Андрэя Вайцяховіча. Дата ў графіці сапсавана, але прыблізна чытаецца як 1667 г. Зверху і знізу ёсць рэшткі рамонтнай тынкоўкі. Калі яна праходзіла над надпісам і зачыняла яе, то мы можам датаваць пачатак рамонту пасляваенным перыядам, што з'яўляецца лагічным. Такім чынам, па датаваным надпісам правядзенне гэтага рамонту можна датаваць перыядам 1649 (1667) – 1703 гг. На адхонах выхаду на паўднёвую галерэю надпісы спыняюць з'яўленне ў XVII ст., Што можа быць звязана з закладкай вакна і пасляваенным рамонтам XVII – пачатку XVIII стст.

Масавае запаўненне прасторы сцен келлі пачынаецца з другога дзесяцігоддзя XVII ст. Пік актыўнасці нанясення графіці прыпадае на 30–40-я гг. XVII ст. У 1650-я гады колькасць надпісаў, ва ўсякім разе, датаваных, памяншаецца, і з кожным дзесяцігоддзем ідзе на спад. Мала графіці XVIII ст., часам яны прадстаўлены толькі лічбай года, што увогуле характэрна і для ўсёй прасторы храма. Адзінкавыя графіці нанесены ў XIX ст. Для параўнання, графіці 20–40-х гг. XVII ст. уяўляюць сабой палову ўсіх датаваных надпісаў, знойдзеных у кампартыменце. Графіці 50–80-х гг. XVII ст. даюць толькі дзясятую частку ад усёй колькасці. XVIII ст. прадстаўлена дзевяццю датаванымі надпісамі, а XIX ст. – двума.

У цэлым трэба адзначыць, што асноўная маса аўтографаў, пакінутых на сценах келлі, суадносіцца з прозвішчамі жыхароў Полацка, вядомых па пісьмовых дакументах таго часу. Гэта карэнныя полацкія сем'і: Корсакі, Шчыты, Падбіпенты, Жукі, Сялявы, Невельскія, Цяпінскія, Кубліцкія, Глазкі, Стаброўскія, Сакалінскія і іншыя. Сярод людзей, якія пакінулі аўтографы ў храме, ёсьць прадстаўнікі полацкага магістрата. У графіці зафіксаваны як прозвішчы прадстаўнікоў шляхты, так і мяшчанства. Вывучэнне і супастаўленне аўтографаў з пісьмовымі крыніцамі – справа будучага даследаванні, а графіці паўднёвага кампартыменту, безумоўна, павінна вывучацца ў комплексе з іншымі надпісамі Спаса-Праабражэнскай царквы.